УДК 373.3.016:821.161.3.09

# СКРАЙБІНГ ЯК ПРЫЁМ ВІЗУАЛІЗАЦЫІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***Т. А. Макарчанка*** (МДУ ім. А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***Д. А. Доўгаль***,
дацэнт

Скрайбінг (ад англ. *scribe* – накідаць эскізы або малюнкі) – спосаб данясення інфармацыі праз ілюстраванне ключавых момантаў. Галоўнае ў скрайбінгу – эфект паралельнай адпаведнасці: галасавое апавяданне паслядоўна суправаджаецца накідамі і замалёўкамі, нярэдка яшчэ і тэкставым запісам апорных паняццяў.

Скрайбінг можна выкарыстоўваць у школе на любым уроку і пры вывучэнні бадай любой тэмы. Падыдзе ён для тлумачэння новага матэрыялу і праверкі засвоенага, можа быць выкарыстаны як сродак абагульнення вывучанага, як дамашняе заданне, пры правядзенні "мазгавога штурму" і рэфлексіі на ўроку.

Пры скрайбінгу выкарыстоўваюць розныя тыпы малюнкаў: піктаграмы, сімвалы, асобныя ключавыя словы (надпісы, лозунгі), схемы і дыяграмы. Скрайбінг можа змяшчацца як на адным аркушы паперы, так і на некалькіх. У ідэале, гледзячы на скрайб-малюнкі, слухач павінен узнавіць у памяці пачуты аповед і хаця б у агульных рысах аднавіць яго [1]. Калі малюнкі падабраны ўдала, гэта не складзе асаблівай цяжкасці. Навык малявання пры гэтым адыходзіць на другі план, паколькі важным з'яўляецца не якасць малюнкаў, а іх сэнсавая дакладнасць і выразнасць.

Ніжэй пададзены распрацаваны намі ў ходзе педагагічнай практыкі ў ДУА "СШ № 43 г. Магілёва" скрайб-запіс першага чатырохрадкоўя верша Адама Русака "Мой край", які вывучаецца ў 3 класе.

Верш А. Русака і яго скрайб-запіс

| Верш "Мой край" | Скрайб-запіс верша |
|---|---|
| *Куды ні глянь – лясы шумяць,*<br>*цвіце за полем гай,*<br>*а поле – вокам не абняць.*<br>*І гэта ўсё – мой край.* |  |

Выкарыстанне дадзенага прыёму дазволіла зрабіць інфармацыю прывабнай і зразумелай для вучняў, дапамагло засвоіць змест твора і паспрыяла яго завучванню на памяць.

## Літаратура

1. Орешко, М. А. Что такое скрайбинг / М. А. Орешко // Мастер-класс "Скрайбинг. Как нарисовать презентацию" [Электронный ресурс]. – 2006. – Режим доступа: https://sites.google.com/site/mkskrajbing/cto-takoe-skrajbing. – Дата доступа: 10.03.2019.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова